Электронныя адукацыйныя рэсурсы: цікава, зручна, эфектыўна

16.08.2018 - 16:19 Адукацыйная прастора

— Сучасны педагог не можа заставацца ў баку ад дасягненняў у ІТ-галіне, — лічыць настаўніца пачатковых класаў кваліфікацыйнай катэгорыі “настаўнік-метадыст” Ала Фёдараўна Ляховіч з Косаўскай сярэдняй школы Івацэвіцкага раёна. — Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі адыгрываюць вялікую ролю ў павышэнні эфектыўнасці навучання, у тым ліку ў пачатковай школе, больш рацыянальным і эканомным выкарыстанні часу і сіл педагога, пашырэнні яго метадычных магчымасцей. Тэхнічнае аснашчэнне нашай школы дазваляе ўсім удзельнікам адукацыйнага працэсу звяртацца да ІКТ як на ўроках, так і ў пазаўрочны час.

На працягу многіх гадоў А.Ф.Ляховіч актыўна выкарыстоўвае ў педагагічнай практыцы інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі. За час работы настаўніца сабрала багатую медыятэку адукацыйных рэсурсаў. Самымі цікавымі і эфектыўнымі, на думку настаўніцы, з’яўляюцца ўрокі з прымяненнем аўтарскіх адукацыйных рэсурсаў і электронных сродкаў навучання, распрацаваных з улікам магчымасцей усяго класа і для канкрэтных дзяцей. Аўтарскія электронныя вучэбна-метадычныя матэрыялы запатрабаваны ў калег і прэзентаваны на абласным і рэспубліканскім узроўні.

— Кожны мультымедыйны рэсурс ствараецца паэтапна, — расказвае Ала Фёдараўна. — Спачатку адбіраецца і сістэматызуецца дыдактычны матэрыял

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее



настаўніку, але і вучням. Электронныя адукацыйныя рэсурсы могуць прымяняцца пры самастойнай рабоце, калі карыстальнік выбірае неабходны матэрыял у адпаведнасці з узроўнем валодання пэўнай тэмай, індывідуальным навучанні дома і дэманстрацыі на ўроках.

Навучальны рэсурс “Трэнажор па чытанні: вучымся чытаць правільна, бегла, усвядомлена” быў прадстаўлены на VII Рэспубліканскім конкурсе “Камп’ютар. Адукацыя. Інтэрнэт” і адзначаны дыпломам III ступені. Азнаёміцца з трэнажорам, уключаным у пералік праграмных сродкаў Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, можна на сайце Нацыянальнага інстытута адукацыі. У 2016 годзе аўтарскі навучальны рэсурс атрымаў дыплом II ступені ў IV Міжнародным конкурсе “Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў творчасці настаўніка пачатковых класаў” (намінацыя “Распрацоўкі-прататыпы дыдактычных гульняў і ЭСН”).

— Трэнажор распрацоўваўся для ўдасканалення чытацкіх навыкаў вучняў, — гаворыць А.Ф.Ляховіч. — Па структуры ён складаецца з 13 раздзелаў, кожны з якіх накіраваны на вырашэнне пэўнай задачы і дапамагае пазбегнуць цяжкасцей пры навучанні чытанню. Падабраныя практыкаванні можна прымяняць,

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

работу дзяцей са слоўнікавымі словамі, фарміруюць станоўчую матывацыю да вывучэння роднай мовы.

Першакласнікам, вядучай дзейнасцю якіх з'яўляецца гульня, прызначаны дапаможнік "Грамацейка". Ён складаецца з 4 раздзелаў, накіраваных на фарміраванне пэўных уменняў і навыкаў. У дапаможніку змешчаны інтэрактыўныя гульнявыя заданні для выкарыстання на розных этапах вывучэння матэрыялу, інтэрактыўныя плакаты, якія прымяняюцца для большай нагляднасці і ў якасці даведачнага матэрыялу, а таксама кантрольна-вымяральныя матэрыялы ў выглядзе тэставых заданняў.

— Вывучэнне велічынь і іх вымярэнняў у матэматыцы адыгрывае важную ролю ў развіцці малодшых школьнікаў, але практыка паказвае, што дзеці засвойваюць гэты матэрыял недастаткова, — адзначае А.Ф.Ляховіч. — Усё залежыць ад арганізацыі вывучэння тэмы. Вялікія магчымасці для гэтага адкрываюць ІКТ. Так, з дапамогай мультымедыйнага рэсурсу "Вывучаем даўжыню з гномамі" вучні могуць завітаць у госці да гномаў і разам з казачнымі героямі ў гульнявой форме прайсці новы матэрыял, замацаваць атрыманыя веды і ацаніць сябе.

У свой час гэты рэсурс у якасці дадатку да ўрока ўдзельнічаў у абласным конкурсе "Мультымедыйны ўрок у адукацыйнай практыцы педагога", дзе быў адзначаны дыпломам I ступені. У 2016 годзе рэсурсы "Вывучаем даўжыню з гномамі" і "Грамацейка" сталі фіналістамі Рэспубліканскага конкурсу "Камп'ютар. Адукацыя. Інтэрнэт".

На працягу апошніх 3 гадоў Ала Фёдараўна займаецца арганізацыяй сеткавага ўзаемадзеяння ў адукацыйным працэсе. Гэта павышае самастойнасць дзяцей, матывуе іх да вучэбнай дзейнасці, паляпшае інфармацыйную кампетэнтнасць настаўнікаў і бацькоў. Для А.Ф.Ляховіч вельмі важна, што дзякуючы інтэрнэту можна шырока трансліраваць уласны вопыт, які становіцца даступным для многіх людзей.

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

конкурсу інтэрнэт-праектаў “ІТ-рашэнні для адукацыі будучыні” гэты праект атрымаў дыплом І ступені ў намінацыі “ІТ-магчымасці ў выхаваўчай рабоце”.

Сеткавы праект “Саламандра”, прысвечаны пажарнай бяспецы, складаецца з некалькіх раздзелаў: “Урокі бяспекі” (інфармацыйныя матэрыялы), “Бацькам” (памяткі і рэкамендацыі), “Мультымедыя” (інфармацыйныя ролікі і мультфільмы), “Гульнятэка” (гульнявыя заданні для замацавання ведаў), “Акцыі”, “Галерэя” і “Нашы справы” (агітацыйныя матэрыялы).

— Адной з новых і перспектыўных форм работы з’яўляецца выкарыстанне адукацыйных анлайн-платформ, — гаворыць А.Ф.Ляховіч. — Віртуальная прастора дазваляе выйсці за рамкі традыцыйнай мадэлі вывучэння прадметаў, а сеткавае ўзаемадзеянне дапаўняе вучэбную праграму. Спалучэнне вочнага і анлайн-навучання дазваляе пабудаваць гібкі адукацыйны працэс з улікам індывідуальных магчымасцей вучняў. Так, мэта адукацыйнага вэб-квеста па пазакласным літаратурным чытанні “У госці да Віталя Біянкі” заключалася ў тым, каб разгледзець твор гэтага аўтара з пазіцыі біёграфа, літаратара, арнітолага і архітэктара для пашырэння кругагляду школьнікаў, іх знаёмства з рознымі крыніцамі інфармацыі. Вэб-квест “Дзядзька Фёдар, сабака і кот” прысвячаўся жыццю і творчасці любімага дзіцячага пісьменніка Эдуарда Успенскага. Дзякуючы ўдзелу ў вэб-квестах вучні атрымліваюць новыя веды, вучацца здабываць іх самастойна і творча выкарыстоўваць.

Адукацыйная анлайн-платформа ў выглядзе сайта “Мая Радзіма — Беларусь” (sites.google.com/site/maaradzimabelarus) была створана для педагогаў, дзяцей і іх бацькоў. Змест платформы сістэматызаваны і ўключае тэматычныя распрацоўкі для 35 урокаў па курсе “Чалавек і свет. Мая Радзіма — Беларусь”. Рэсурс дапамагае вучням бліжэй азнаёміцца з даволі складаным для пачатковай школы прадметам, дазваляе замацаваць, абагульніць і сістэматызаваць веды чацвёртакласнікаў пра нашу краіну. Дыдактычныя матэрыялы можна лёгка

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

— Матэрыялы сеткавых рэсурсаў не толькі правяраюць веды дзяцей, але і выклікаюць у іх цікавасць да вучобы, — адзначае А.Ф.Ляховіч. — А павышэнне цікавасці абавязкова адаб'ецца на ўзроўні падрыхтоўкі і паспяховасці школьнікаў. Гульнявыя заданні ўзмацняюць эмацыянальнае ўспрыманне, актывізуюць увагу вучняў. Усё гэта фарміруе трывалыя веды. Безумоўна, арганізацыя сеткавага ўзаемадзеяння і работы вучняў з электроннымі рэсурсамі павінна быць прадуманай, падрыхтаванай і спланаванай. Толькі тады можна разлічваць на добрыя вынікі. Але заўсёды трэба памятаць, што цуды ствараюць не камп'ютары і інтэрактыўныя дошкі, а настаўнікі, у чыіх умелых руках гэтыя інструменты дораць дзецям радасць пазнання.

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ.

Еще материалы рубрики

Сябраваць анлайн

12.02.2023

Хто хоча — той даб'ецца

12.02.2023

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

Чтобы ребенок не заболел: советы педиатра родителям в сезон простуд

Не изменяя себе, семье, стране. Молодежь на «НЕскучной НЕлекции» в Молодечно рассуждала о жизненном выборе

Цікавасць да фізкультуры і здаровага ладу жыцця настаўнік Дзяніс Казлюк павышае ў выхаванцаў уласным прыкладам

АВТОРСКИЕ КОЛОНКИ

ИГОРЬ ГРЕЧКО

БЫЛЫХ НАСТАЎНІКАЎ НЕ БЫВАЕ



ИВАН ЖДАНОВИЧ

ГЭТЫМ ЗЯЛЁНЫМ ШЧЫТОМ…



ТАТЬЯНА БОНДОРЕВА

З’ЯДНАНЫЯ СКАРЫНАЎСКІМІ ДНЯМІ



2024 БЕЛАРУСЬ ГОД КАЧЕСТВА

Репортаж

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее

ШКОЛА
УПРАВЛЕНИЯ

На здоровый лад

Чтобы ребенок не заболел: советы педиатра родителям в сезон простуд

©2014-2024 Редакционно-издательское учреждение «Издательский дом «Педагогическая пресса»

На портале nastgaz.by для улучшения его работы и повышения эффективности используются cookies. Оставаясь на нашем сайте, вы соглашаетесь с размещением на своем компьютере или ином персональном устройстве cookie-файлов.

Ok Подробнее